# З вопыту рэалізацыі інфармацыйна-адукацыйнага праекта “ШАГ“ – “Школа актыўнага грамадзяніна“ у дзяржаўнай установе адукацыі “Люсінская сярэдняя школа імя Якуба Коласа“ Ганцавіцкага раёна Брэсцкай вобласці

**25.04.2024 – інфармавацыйны час ў рамках рэалізацыі праекта “ШАГ“.**

**Тэма:** “Радзіма мая Беларусь у асобах. З клопатам аб здароўі (аб медыцынскіх супрацоўніках) “.

**Мэта:** стварэнне умоў для спрыяння узрастання цікавасці да прафесіі медыцынскіх спецыяльнасцей, выхаванне паважлівых адносін да медыцынскіх супрацоўнікаў.

**Удзельнікі:** вучні 8-11 классов ДУА “Люсінская сярэдняя школа імя Якуба Коласа”

24 красавіка 2024 года ў ДУА “Люсінская сярэдняя школа імя Якуба Коласа“ ў рамках інфармацыйна-адукацыйнага праекта “Школа актыўнага грамадзяніна” прайшла інфармацыйная гадзіна на тэму “Радзіма мая Беларусь у асобах. З клопатам аб здароўі” (аб медыцынскіх супрацоўніках).



Падчас першага этапу “Мы даведваемся”, у ходзе інтэрактыўнай віктарыны, вучні актыўна праявілі сябе ў пытаннях аб сістэме аховы здароўя Рэспублікі Беларусь. Старшакласснікі разважалі аб клопаце дзяржавы аб здароўя народа, успаміналі, якія аздараўленчыя мерапрыемствы праводзяцца ў нашай краіне, а таксама пералічылі, ў якіх фізкультурна-аздараўленчых і спартыўна-масавых мерапрыемствах удзельнічалі самі.



На пятае пытанне, якімі якасцямі павінен валодаць медыцынскі работнік, вучні запрасілі адказаць фельдшара Люсінскай амбулаторыі агульнай практыкі Занька Людмілу Віктараўну. Цікавым сурпрызам для дзяцей стала тое, што Людміла Віктараўна прыйшла не з пустымі рукамі, а з сапраўдным працоўным арсеналам медыцынскага работніка. Пад дэвізам “Лепш адзін раз паглядзець, чым некалькі паслухаць”, фельчар пачала знаёміць вучняў з некаторым медыцынскім абсталяваннем, з якім звычайна яна едзе на выклік “хуткай дапамогі”.

Старшакласнікі паглядзелі, як працуе глюкометр, партатыўны ЭКГ, танометр. Таксама вучні атрымалі памяткі аб відах ін’екцый і як іх правільна ўводзіць і памятку аб аказанні першай медыцынскай дапамогі.




Людміла Віктараўна ужо дваццаць гадоў дапамагае людзям зберагаць сваё здароўе, распавядала вучням аб сваім вопыце выбару правесіі і аб студэнцкіх гадах. Таксама фельчар падзялілася успамінамі аб першых гадах сваёй працы, самых запамінальных эпізодах медыцынскага жыцця. Вучняў вельмі ўразіла, наколькі самааданым чалавекам патрэбна быць, каб бескарысна і адважна дапамагаць людзям, рабіць гэта шчыра і якасна.

*Курылік А.А.,*
*намеснік дырэктара па АД*
*ДУА «Люсінская сярэдняя школа*
*імя Якуба Коласа»*